# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

УДК 316.723-053.2:130.2

*А. І. Смолік*

## Культуралогія дзяцінства: пастаноўка праблемы

*Даследуюцца тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вывучэння феномена дзяцінства. Аўтар прыходзіць да высновы, што ў навуковым дыскурсе дзіцячая субкультура інтэрпрэтуецца як самастойная аўтаномная з'ява, і абгрунтоўвае неабходнасць вылучэння асобнай інтэграцыйнай галіны культуралагічных ведаў – культуралогіі дзяцінства.*

На ўсіх этапах развіцця гуманітарных навук феномен дзяцінства з'яўляўся аб'ектам увагі педагогаў, псіхолагаў, сацыёлагаў, філосафаў, мастацтвазнаўцаў. Вылучэнне праблемнага поля дзяцінства ў самастойную галіну гуманітарных ведаў пачалося ў сярэдзіне XVIII ст. Важнай з'явай, якая падштурхнула грамадства і навукоўцаў да вывучэння свету дзяцінства, стала праца Ж.-Ж. Русо «Эміль, або Аб выхаванні», якая была апублікавана ў 1762 г. Аўтар прапанаваў тэорыю свабоднага выхавання, якая змяшчала тры палажэнні: мэтазгоднасць натуральнага выхавання; адметнасць паміж дзецьмі і дарослымі; адрозненні ў этапах развіцця дзяцей. Перш за ўсё ён звяртаў увагу бацькоў на неабходнасць вывучэння сутнасці дзіцяці, яго ўнутранага свету, перажыванняў, задаткаў і здольнасцей [24, с. 22–23]. Пад уплывам ідэй Ж.-Ж. Русо І. Г. Песталоці развіў тэорыю свабоднага выхавання і тым самым адкрыў новую старонку ў вывучэнні дзяцінства [20]. На працягу XVIII ст. адбывалася паступовае назапашванне эмпірычнага матэрыялу ў выглядзе сістэматычных дзённікавых запісаў і асобных назіранняў за ходам псіхічнага і фізічнага стану дзяцей. Былі зроблены першыя спробы сістэматызацыі і абагульнення эксперыментальных матэрыялаў. Пры гэтым вызначаны розныя тэарэтычныя пазіцыі ў разуменні характару і рухаючых дэтэрмінант развіцця дзяцей.

Выключную ролю ў станаўленні гуманістычнай сістэмы адукацыі і выхавання дзяцей, засваенні імі культурнага вопыту абгрунтоўвалі на працягу XIX – пачатку XX ст. П. П. Блонскі [4], Л. С. Выгоцкі [7], Ф. А. В. Дыстэрвег [39], Ж. Піяжэ [21] і інш. Тэарэтычнае асэнсаванне выклікала неабходнасць стварэння цэласнага ўяўлення пра асобу дзіцяці ў розныя ўзроставыя перыяды, што паспрыяла з'яўленню спе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыяльнай навукі – *педалогіі.* Яе заснавальнікамі былі В. В. Зяньkoўскі [12], Я. А. Пакроўскі [22], К. Д. Ушынскі [31] і інш. З іх навуковых прац, на наш погляд, пачынае існаванне псіхалогія дзяцінства як адмысловая навука. Упершыню імі былі выкладзены асновы навуковай методыкі па вывучэнні дзяцінства, дадзены ўзор збору неабходнага матэрыялу.

Цікавасць да даследавання праблем дзяцінства прыкметна актуалізуецца ў розных краінах. У Амерыцы папулярнасць набываюць творы Дж. М. Болдуіна, у якіх вучоны пазначыў сацыяльна-псіхічныя ўмовы развіцця ўнутранага свету дзіцяці. У яго працах пераадольваецца аднабаковая сувязь праблем дзяцінства з пытаннямі псіхічнай эвалюцыі: псіхалогія дзяцінства злучаецца з сацыяльнай псіхалогіяй [5]. У Францыі вядомы даследчык інтэлектуальнага жыцця дзяцей А. Біне прапанаваў арыгінальны метад вымярэння інтэлектуальнага ўзроўню дзіцяці [36]. У Германіі грунтоўнае значэнне мелі працы К. Гроса, у якіх з дакладнасцю ахарактарызавана своеасаблівасць дзяцінства: яно ўпершыню разглядаецца як замкнёная самастойная фаза ў развіцці чалавека [40]. У працах вучонага даследуюцца і класіфікуюцца дзіцячыя тыпы, абгрунтоўваецца тэзіс аб абумоўленасці іх дзеянняў і ўчынкаў унутранымі і знешнімі фактарамі.

Прадстаўнікі заходнееўрапейскай, амерыканскай і расійскай псіхалогіі даказвалі, што дзіця – гэта цэласная сістэма. Зразумець яго можна, толькі ўлічваючы сацыяльнае асяроддзе, якое аказвае ўплыў на псіхічнае і марфалагічнае развіццё.

У пачатку XX ст. праблемы развіцця дзіцяці разглядаюцца ў псіхааналітычных тэорыях З. Фрэйда [33], Э. Эрыксана [34], К.-Г. Юнга [35]. Значны ўклад у даследаванне субкультуры дзяцінства ўнёс французскі дэмограф і гісторык Ф. Арыес [3].

Грунтоўна падышлі да праблемы вывучэння культуры дзяцінства савецкія навукоўцы Г. С. Вінаградаў [6], В. А. Сухамлінскі [28], Б. М. Цяплоў [29] і інш. Так, Г. С. Вінаградаў сістэматызаваў назапашаныя веды і даследаваў складнікі дзіцячай культуры. Ён адным з першых выказаў думку, што культура дзяцінства мае самабытныя, не ўласцівыя свету дарослых асаблівасці, абумоўленыя характэрнымі рысамі дзіцячага ўзросту. Найважнейшая каштоўнасць прац В. А. Сухамлінскага, на наш погляд, заключаецца ў вызначэнні методыкі развіцця творчых здольнасцей дзяцей. Праблемам адоранасці дзяцей прысвечаны асобныя працы Б. М. Цяплова.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў XX ст. дзяцінства паступова становіцца самастойным аб'ектам сацыяльна-гуманітарных навуковых дысцыплін. Аднак, нягледзячы на з'яўленне названых вышэй даследаванняў асобных аспектаў фізічнага, псіхічнага і духоўнага развіцця, праблемы фарміравання асобы дзіцяці не атрымалі ў XIX – першай палове XX ст. комплекснага, сістэмнага вывучэння. Дзяцінства па-ранейшаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было аб’ектам у асноўным педагагічнага, псіхалагічнага, валіялагічнага, сацыяльна-псіхалагічнага аналізу.

Запоўніць гэты прабел спрабавалі прадстаўнікі навуковага напрамку «Этнаграфія дзяцінства» І. С. Кон [13], М. Мід [17] і інш. Іх пошукі былі звязаны з характарыстыкай этнічнай своеасаблівасці інкультурацыі дзяцей у прасторы культуры свайго народа. Пры гэтым асноўная ўвага звярталася на традыцыйна-архаічныя культуры. Аднак, на наш погляд, этнаграфія дзяцінства з’яўляецца толькі часткай вывучэння шматаспектнай дзіцячай культуры. Варта таксама мець на ўвазе, што калі ў архаічных культурах дзіця развіваецца ў лакальным хранатопе свайго этнасу, то ў сучасным інфармацыйным грамадстве яно адкрыта для ўздзеяння каштоўнасцей агульначалавечай культуры. Таму для больш поўнага разумення культуры дзяцінства неабходна даследаваць этнічныя асаблівасці многіх народаў у постіндустрыяльную эпоху, улічваючы, што дзеці развіваюцца ў свеце агульначалавечай культуры, з якой яны кантактуюць пры дапамозе сучасных сродкаў масавай інфармацыі. Тым не менш нават паглыбленае вывучэнне названых вышэй аспектаў дзяцінства не магло даць цэласнага інтэграцыйнага ўяўлення пра спецыфіку дзіцячай культуры.

У шматлікіх даследаваннях сутнасці, зместу, тыпаў дзіцячай папуляцыі, якія праводзіліся заходнімі і расійскімі гуманітарыямі, аспекты дзіцячай культуры ў першай палове ХХ ст. закранаіліся фрагментарна.

У другой палове ХХ ст. намячаецца паварот да вывучэння сацыяльна-культурных аспектаў дзяцінства. Навукоўцы акцэнтуюць увагу не столькі на псіхалогіі індывіда, колькі дзіцячых груп і супольнасцей, на аналізе сацыяльна-культурных фактараў дзіцячай інкультурацыі. Гэты кірунак прадстаўлены ў працах В. В. Абраменкавай [1], Я. А. Пакроўскага [22], Д. І. Фельдштэйна [32] і інш. Пры ўсім значэнні гэтых даследаванняў па-за межамі заставаліся маральныя, эстэтычныя, рэлігійныя, сацыяльна-прававыя, экалагічныя і іншыя аспекты ўключэння дзіцяці ў свет культуры.

Канец ХХ – пачатак ХХІ ст. у Расіі і заходнееўрапейскіх краінах адзначаны ростам даследаванняў субкультурных утварэнняў. Гэта, на наш погляд, было абумоўлена сацыяльнай неаднастайнасцю постіндустрыяльных соцыумаў, якія ўяўлялі сабой мазаічную структуру, што складалася з сацыяльна-прафесійных, сацыяльна-дэмаграфічных і сацыяльна-этнічных слаёў. Разам з існаваннем старых стратыфікацыйных пластоў адыходзячага індустрыяльнага грамадства ў ім фарміраваліся новыя субкультурныя супольнасці: прадпрымальнікі, менеджары, банкіры, фермеры, асобы свабодных прафесій, маргінальныя групы і інш. Гэтыя сацыякультурныя страты, блізкія па вонкавых характарыстыках, аб’яднаныя агульнымі прыкметамі, каштоўнаснымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстаноўкамі, спецыфічнымі артэфактамі, замацоўваліся ў пэўных рысах паводзін, успрымання свету, мовы. Падобнага роду феномены ў культуралогіі прынята называць субкультурай. Гэта абазначэнне фіксуе аўтаномію дадзенай з'явы.

У ЗША, Англіі, Францыі вывучэннем субкультур займаліся М. Брэйк [37], Н. Смелзер [26], Ф. Дэвіс [38], якія інтэрпрэтавалі іх як сістэму норм і каштоўнасцей, што адрозніваюць пэўную сацыяльную групу ад большасці грамадства. Грунтоўнасцю даследавання феномена субкультуры характарызуюцца працы такіх прадстаўнікоў расійскага сацыягуманітарнага дыскурсу, як Ю. М. Давыдаў [11], П. С. Гурэвіч [9], С. І. Левікава [14], С. Я. Мацвеева [16] і інш. Яны вызначалі субкультуру як асаблівую сферу культуры, цэласнае ўтварэнне ўнутры пануючай культуры, адметнае ўласнай каштоўнаснай сістэмай, звычаямі і нормамі.

Асобныя аспекты маладзёжных субкультурных фарміраванняў даследаваліся шэрагам беларускіх навукоўцаў: І. М. Андрэевай [2], В. Л. Гуцько [10], С. В. Масленчанка [15], Т. В. Сянько [25], Н. Ю. Токавай [30] і інш. Імі абазначаны фактары, якія спараджаюць субкультуры моладзі, іх функцыі і тыпы. Асаблівасцю прац беларускіх аўтараў з'яўляецца раскрыццё сацыякультурных характарыстык і спецыфікі дынамікі субкультур, што абумоўлена ўздзеяннем сацыяльных сетак Інтэрнэту.

На працягу першай чвэрці XXI ст. у гуманітарным дыскурсе змянілася разуменне зместу тэрміна «суб'ект культуры»: пераглядаюцца сацыяльна-культурныя функцыі і роля суб'екта, яго месца ў сацыяльнай структуры; на больш глыбокім узроўні даследуецца праблема ўзаемаадносін асобы і грамадства. Разам з тым у навуцы складваецца гістарычна новы тып успрымання дзяцінства і дзіцячага развіцця, змяняецца ўяўленне аб яго статусе ў сістэме чалавечай культуры, дзеці разглядаюцца як раўнапраўныя і актыўныя члены соцыуму. Узнікае паняцце «дзіцячая субкультура», якое інтэрпрэтуецца з розных тэарэтыка-метадалагічных падыходаў.

На сучасным этапе развіцця культуралогіі субкультура дзяцінства вывучаецца як самастойны сацыяльны і культурны феномен са сваімі кампанентамі, унутранымі ўзаемазлучанымі з'явамі. У Беларусі, Расіі, заходнееўрапейскіх краінах з'яўляюцца даследаванні, у якіх з культурантрапалагічных пазіцый прааналізавана дзіцячая субкультура, яе адметнасці: апазіцыя да свету дарослых і жаданне жыць у тайне ад іх; наяўнасць асаблівага сакрэтнага кода; прынцып тэрытарыяльнай аўтаноміі кожнай групы і вострае ўнутранае саперніцтва; наяўнасць уласнай мовы (жаргону), а таксама рытуалаў, гульняў і г. д. Дзіцячая субкультура трактуецца як з'ява жыцця дзяцей, якое вызначае якасныя змены ў іх прыродзе, адносінах і светаразуменні, што дазваляе адрозніваць аднаго суб'екта ад іншага.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз субкультурных утварэнняў сведчыць аб багатай варыяцыйнасці і ўнікальнасці субкультур, створаных раней, і тых, што нараджаюцца ў сучасным грамадстве. Тыпалогія разнастайнасці субкультурнага свету дае магчымасць вызначыць пэўную агульнасць усіх непаўторных элементаў і адметную асаблівасць кожнага тыпу субкультур. У культуралагічным дыскурсе найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца дзве тыпалогіі: апісальная і фармальна-прававая [15]. Аднак ні ў той, ні ў другой дзіцячая субкультура не вылучаецца ў якасці асаблівага тыпу, хоць у групу фармальна-прававых субкультурных утварэнняў уключаны тып прасацыяльных субкультур (аб'яднанні экалагічнай, мастацкай, геданістычна-забаўляльнай накіраванасці). Гэта тлумачыцца тым, што на працягу XX ст. у многіх беларускіх і замежных гуманітарыяў узнікла сумненне ў выдзяленні дзіцячай субкультуры ў акрэслены тып і выяўленні існавання своеасаблівай дзіцячай карціны свету, этыкі нарматыўных адносін, мастацтва, традыцый, фальклору і г. д. Культура грамадства, будучы «культурай дарослых», доўга адмаўляла свету дзяцінства ў прызнанні яго як адметнага суб'екта культурнай творчасці. Спатрэбіліся дзесяцігоддзі ўпартай працы і карпатлівых даследаванняў, каб вылучыць у гуманітарных ведах катэгорыю «дзіцячая субкультура» і ўвесці дадзеную дэфініцыю ў навуковы ўжытак у якасці культуралагічнага канцэпту.

У першай чвэрці XXI ст. цікавасць да дзяцінства ў гуманітарным дыскурсе прыкметна ўзмацняецца: выдаюцца зборнікі дзіцячых вершаў, песень, праводзяцца даследаванні свету дзяцінства, яго статусу, функцый і адрозненняў ад свету дарослых. Такім чынам, у рамках міждысцыплінарнага падыходу паступова фарміруецца міждысцыплінарнае паняцце «субкультура дзяцінства». На думку расійскага культуролага В. В. Абраменкавай, сацыягенетычны аналіз субкультуры дзяцінства з'яўляецца значным для развіцця свядомасці і асобы дзіцяці як члена дзіцячай супольнасці, групы аднагодкаў. Яна вылучае кампаненты дзіцячай субкультуры, іх узаемасувязь і значнасць для свету дзяцінства, а таксама функцыі, якія выконвае дадзеная субкультура ў працэсе росту і развіцця дзіцяці. У працы «Сацыяльная псіхалогія дзяцінства» В. В. Абраменкава піша: «У агульначалавечай культуры дзіцячая субкультура займае падпарадкаванае месца і разам з тым яна валодае адноснай аўтаноміяй, паколькі ў любым грамадстве дзеці маюць сваю ўласную мову, розныя формы ўзаемадзеяння, свае маральныя рэгулятывы паводзін, вельмі ўстойлівыя для кожнага ўзроставага ўзроўню, і развіваюцца ў значнай ступені незалежна ад дарослых. Дзіцячая субкультура – аўтаномнае цэласнае ўтварэнне ўнутры культуры дарослых, якая ўяўляе сабой розныя ўзроставыя групы, сацыяльныя пласты, рэгіянальныя супольнасці, нефармальныя аб'яднанні і інш.» [1, с. 109].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзіцячую субкультуру як навуковую праблему пазначаюць і іншыя расійскія даследчыкі. На погляд А. С. Нагаткінай, дзіцячая субкультура з'яўляецца асаблівай культурай у агульнай культуры і вызначае якасныя змены ў прыродзе, уяўленні і светаразуменні, якія дазваляюць адрозніваць адно дзіця ад другога; уключае ўзаемазвязаныя кампаненты: фізіялагічныя даныя, спадчынныя фактары, псіхічныя працэсы, фактары актыўнасці, сацыяльна неабходныя якасці і дзіцячую мадэль свету [18].

Метадалагічнае даследаванне дзіцячай субкультуры ажыццявіла Т. Д. Папкова, якая лічыць, што веданне мадэлі культуры дзяцей, яе асаблівасцей і функцый неабходна, так як яна не існуе асобна ад грамадства, а функцыянуе як культура ў культуры і выконвае шэраг значных функцый: сацыялізуючую, псіхатэрапеўтычную, культураахоўную, прагнастычную і інш. [23]. Да названых функцый можна дадаць яшчэ некалькі, з нашага пункту гледжання, таксама не менш важных: пазнавальную, выхаваўчую, камунікатыўную, эстэтычную, сацыянарматыўную.

Аб'ектыўную неабходнасць вылучэння дзіцячай субкультуры з мноства субкультурных утварэнняў сучаснасці абгрунтоўваюць беларускія навукоўцы. Паводле культуролага Т. Л. Ойстрах-Дзямідавай, без разумення дзіцяці на ўзроўні яго суб'ектыўнай культуры немагчыма нешта змяніць да лепшага ў адукацыйных і выхаваўчых сістэмах грамадства. Сацыяльна неабходныя якасці зададзены ў культуры і адукацыі ў форме мэт і каштоўнасцей, але яны ж выяўляюць сябе ў рознай ступені ў характары і паводзінах дзяцей. Ступень выяўленасці сацыяльна неабходных якасцей і вызначае ўзровень дзіцячай субкультуры. Суб'ектыўнасць яе характарызуецца адрозненнем ад вядомых, устойлівых тэндэнцый развіцця культуры грамадства і перспектывай удасканалення ўласных форм [19].

Культуролаг Д. А. Смолік адзначае, што сярод кампанентаў, якія ўтвараюць субкультуру дзяцінства, значнае месца займае карціна свету, якая выразна праяўляецца ў мастацкай творчасці дзяцей. У працэсе мастацкай творчасці яны не толькі асвойваюць сацыяльна-культурны вопыт, але і ствараюць новыя духоўныя каштоўнасці, якія ўзбагачаюць свет дзяцінства. Для дзяцей як суб'ектаў асаблівай культуры, мяркуе даследчык, характэрны арыгінальнасць творчага мыслення, дзіцячая непасрэднасць, шчырае праяўленне пачуццяў і эмоцый, яскравасць мастацкіх вобразаў і сімвалаў, рамантычнае ўспрыманне і адлюстраванне свету [27].

Пэўную цікавасць для вывучэння духоўна-змястоўнага свету дзяцінства ўяўляе дысертацыйнае даследаванне мастацтвазнаўцы В. А. Грачовай, у якім ажыццёўлены кампаратыўны аналіз эстэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і аксіялагічных аспектаў праблемы, увасобленых у еўрапейскім мастацтве [8].

Такім чынам, аналіз тэарэтыка-метадалагічных падыходаў у сучасным гуманітарным дыскурсе сведчыць: дзіцячая субкультура інтэрпрэтуецца як самастойная сэнсавая прастора каштоўнасцей, установак, спосабаў дзейнасці і форм камунікацыі, якія ажыццяўляюцца ў дзіцячых супольнасцях у той ці іншай канкрэтна-гістарычнай сацыяльнай сітуацыі развіцця. У шырокім сэнсе – гэта ўсё, што створана чалавечым грамадствам для дзяцей і дзецьмі. У агульначалавечай культуры дзіцячая субкультура займае падпарадкаванае месца, валодаючы разам з тым адноснай аўтаноміяй. Яна з'яўляецца носьбітам сацыяльна-культурных інварыянтаў артэфактаў розных эпох, архетыпаў, зафіксаваных у дзіцячай мове, мысленні, гульнях і фальклоры. Прызнанне статусу дзяцінства ў якасці суб'екта субкультурнага ўтварэння дазваляе гаварыць аб неабходнасці фарміравання асобнай інтэграцыйнай галіны культуралагічных ведаў, мэтай якой з'яўляецца комплекснае сістэмнае вывучэнне дадзенага сацыякультурнага феномена. На наш погляд, наспела неабходнасць нараўне з дзіцячай педагогікай, дзіцячай псіхалогіяй, педалогіяй фарміравання культуралогіі дзяцінства.

1. *Абраменкова, В. В.* Социальная психология детства: развитие отношений ребенка в детской субкультуре / В. В. Абраменкова. – М. ; Воронеж : МПСИ : МОДЭК, 2000. – 416 с.

2. *Андреева, И. Н.* Субкультура / И. Н. Андреева // Социологическая энциклопедия / под общ. ред. А. Н. Данилова. – Минск, 2003. – С. 321.

3. *Ариес, Ф.* Ребенок и семейная жизнь при Старом порядке / Ф. Ариес. – Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 1999. – 416 с. – (Другая история).

4. *Блонский, П. П.* Психология младшего школьника / П. П. Блонский. – Воронеж : МОДЭК ; М. : Изд-во Моск. психол.-социал. ин-та, 2006. – 631 с. – (Психологи России).

5. *Болдуин, Дж. М.* Духовное развитие детского индивидуума и человеческого рода : в 2 т. : пер. с англ. / Дж. М. Болдуин. – Изд. 2-е. – М. : URSS : Либроком, 2010. – 2 т.

6. *Виноградов, Г. С.* Страна детей : Избр. тр. по этнографии детства / Г. С. Виноградов ; сост., подгот. текста, библиогр., архив. материалы, коммент. А. В. Грунтовского, А. Ф. Некрыловой, В. В. Головина. – СПб. : Историческое наследие, 1999. – 548 с.

7. *Выготский, Л. С.* Мышление и речь. Психологические исследования / Л. С. Выготский. – М. : Лабиринт, 1996. – 416 с. – (Философия риторики и риторика философии).

8. *Грачева, О. О.* Типология образов детства в европейском искусстве Нового времени : автореф. дис. … канд. искусств. : 17.00.09 / О. О. Грачева ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2008. – 25 с.

9. *Гуревич, П. С.* Субкультура / П. С. Гуревич // Культурология, XX в. : слов. – СПб., 1997. – С. 450.

10. *Гутько, О. Л.* Студенческая субкультура Беларуси как отражение трансформации общества : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / О. Л. Гутько ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2009. – 23 с.

11. *Давыдов, Ю. Н.* Социология контркультуры: инфантилизм как тип мировосприятия и социальная болезнь / Ю. Н. Давыдов, И. Б. Роднянская ; АН СССР, Ин-т социол. исследований. – М. : Наука, 1980. – 264 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Зеньковский, В. В.* Психология детства / В. В. Зеньковский. – М. : Academia, 1995. – 265 с. – (Философско-психологическая б-ка).

13. *Кон, И. С.* Детство как социальный феномен / И. С. Кон // Журнал исследований социальной политики. – 2004. – Т. 2, № 2. – С. 151–174.

14. *Левикова, С. И.* Молодежная субкультура / С. И. Левикова. – М. : Фаир-пресс, 2004. – 608 с.

15. *Масленченко, С. В.* Социальная структура сетевого пространства / С. В. Масленченко. – Минск : Изд. А. Н. Вараксин, 2011. – 200 с.

16. *Матвеева, С. Я.* Субкультуры в динамике культуры / С. Я. Матвеева // Субкультурные объединения молодежи: критический анализ : препринты докл. всесоюз. науч. конф. «Культура и ее роль в активизации человеческого фактора», 1987 г. / АН СССР, Ин-т философии ; отв. ред. И. К. Кумачева. – М., 1987. – С. 16–23.

17. *Мид, М.* Культура и мир детства / М. Мид ; пер. с англ. и коммент. Ю. А. Асеева ; сост. и послесловие И. С. Кона. – М. : Наука, 1988. – 429 с.

18. *Нагаткина, Е. С.* Детская субкультура как научная проблема / Е. С. Нагаткина // Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение. Вопросы теории и практики. – 2011. – № 3 (9). – С. 129–136.

19. *Ойстрах-Демидова, Т. Л.* Детская художественная культура / Т. Л. Ойстрах-Демидова. – Минск : Веды, 2003. – 140 с.

20. *Песталоцци, И. Г.* Книга для матерей : избранное / И. Г. Песталоцци ; вступ. ст. А. В. Калинченко. – М. : Карапуз, 2009. – 251 с.

21. *Пиаже, Ж.* Речь и мышление ребенка / Ж. Пиаже. – М. : Педагогика-Пресс, 1999. – 528 с.

22. *Покровский, Е. А.* Значение детских игр в отношении воспитания и здоровья / Е. А. Покровский. – М. : Тип. А. А. Карцева, 1884. – 311 с.

23. *Попкова, Т. Д.* Методология исследования детской субкультуры / Т. Д. Попкова // Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение. Вопросы теории и практики. – 2011. – № 3 (9). – С. 129–136.

24. *Руссо, Ж.-Ж.* Эмиль, или О воспитании / Ж.-Ж. Руссо ; пер. с фр. М. А. Энгельгардта. – СПб. : Изд-во газеты «Школа и жизнь», 1913. – 489 с.

25. *Сенько, Т. В.* Молодежная субкультура как социально-психологический феномен / Т. В. Сенько // Адукацыя і выхаванне. – 2002. –№ 11. – С. 41–47.

26. *Смелзер, Н.* Культура / Н. Смелзер // Социология. – М., 1998. – С. 40–69.

27. *Смолик, Д. А.* Детская субкультура: определение и содержание / Д. А. Смолик // Наука о детстве: современные психолого-педагогические проблемы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 4–5 дек. 2003 г. / отв. ред. Н. В. Литвина. – Минск, 2003. – С. 169–171.

28. *Сухомлинский, В. А.* Сердце отдаю детям / В. А. Сухомлинский. – Минск : Нар. асвета, 1982. – 286 с.

29. *Теплов, Б. М.* Психология музыкальных способностей / Б. М. Теплов. – М. : АПН, 1997. – 340 с.

30. *Токова, Н. Ю.* Молодежная субкультура и ее региональные аспекты : моногр. / Н. Ю. Токова. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2003. – 76 с.

31. *Ушинский, К. Д.* Человек как предмет воспитания. Опыт педагогической антропологии / К. Д. Ушинский. – М. : Фаир-пресс, 2004. – 576 с.

32. *Фельдштейн, Д. И.* Социальное развитие в пространстве времени детства / Д. И. Фельдштейн. – М. : Флинта, 1997. – 160 с.

33. *Фрейд, З.* Психоанализ. Религия. Культура : сб. / З. Фрейд ; пер., вступ. ст. А. М. Руткевича ; примеч. В. В. Бибхина, А. М. Руткевича. – М. : Ренессанс, 1992. – 291 с.

34. *Эриксон, Э. Г.* Детство и общество / Э. Г. Эриксон ; пер. и науч. ред. А. А. Алексеева. – 2-е изд., перераб. и доп. – СПб. : Психол. центр «Ленато», 1996. – 590 с.

35. *Юнг, К.-Г.* Психологические типы / К.-Г. Юнг ; пер. с нем. С. Лорие ; перераб. и доп. В. Зелинским. – СПб. : Юнвеста : Прогресс-Универс, 1995. – 716 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

36. *Binet, A.* Méthodes nouvelles pour le diagnostic du niveau intellectuel des anormaux / A. Binet, Th. Simon // L'année psychologique. – 1905. – V. 11. – P. 191–244.
37. *Brake, M.* Cultural revolution or alternative delinquency: an examination of deviant youth as a social problem / M. Brake // Contemporary social problems in Britain / ed. by R. Bailey, J. Young. – London, 1973. – P. 33–50.
38. *Davis, F.* On youth subcultures: The hippie variant / F. Davis. – New York : General Learning Press, 1971. – 723 p.
39. *Diesterweg, F. A. W.* Wegweiser zur Bildung für Deutsche Lehrer und die Lehrer werden wollen / F. A. W. Diesterweg. – Essen : Bädeker, 1850. – 427 S.
40. *Groos, K.* Die Spiele der Menschen / K. Groos. – Jena : Verlag von Gustav Ficher, 1899. – 539 S.

*A. Smolik*

**Cultural studies of childhood: problem statement**

*Theoretical and methodological approaches to the study of the phenomenon of childhood are studied. The author concludes that in the scientific discourse children's subculture is interpreted as an independent autonomous phenomenon, and substantiates the need to single out a separate integration branch of cultural knowledge – cultural studies of childhood.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 28.02.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ